14. *Луцкевіч, А.* За дваццаць пяць гадоў (1903–1928). Успаміны аб працы першых беларускіх рэвалюцыйных арганізацый БРГ, БСГ / А. Луцкевіч. – Вільня: Беларус. друк. імя Ф. Скарыны, 1928. – 51 с.
15. Walka. – 1903. – № 3.

**Дата поступления: 20.11.2018.**

*Шыдлоўскі С. А.*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацк

*Shydlouski S.*
Polotsk State University, Polotsk

**УДК 39(37.01)«18/19»**

# ТРАДЫЦЫІ МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫІ МІНУЛАГА Ў КУЛЬТУРЫ ПАМЕСНАГА ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ)

# THE TRADITIONS OF MEMORIALIZATION OF THE PAST IN THE CULTURE NOBILITY OF BELARUS (LATE XVIII – EARLY XX CENTURIES)

*У артыкуле разглядаюцца традыцыі мемарыялізацыі мінулага ў культуры дваранства Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. Вызначаюцца разнастайныя сродкі захавання і трансляцыі сямейных традыцый у асяроддзі беларускага прывілеяванага саслоўя. У прыватнасці, апісваюцца спосабы мемарыялізацыі месцаў пахавання продкаў. Робіцца выснова аб наяўнасці спецыфічнага адукацыйнага і сацыялізуючага асяроддзя маёнтка, у якім адбываўся працэс узнаўлення культуры дваранскага памешчыцкага саслоўя.*
*Ключавыя словы: традыцыі мемарыялізацыі; культура дваранства; дваранскі маёнтак; гістарычная свядомасць.*

*The article discusses the tradition of the memorialization of the past in the culture of the nobility of Belarus late XVIII – early XX centuries. Determined by a variety of means of preservation and transmission of family traditions in the environment of the Belarusian privileged classes. In particular, it describes the ways memorialization of the burial places of their ancestors. It is concluded that there is a specific educational and socializing environment of the estate, in which there was a process of reproduction of the culture of the noble estate.*
*Keywords: the tradition of memorialization; aristocratic culture; noble estate; historical consciousness.*

Для паменснага дваранства Беларусі маёнткі з'яўляліся ўвасабленнем «малой радзімы». Культурны ландшафт сядзіб акумуліраваў сямейныя традыцыі і гістарычную памяць, уплываў на фарміраванне саслоўна-радавой ідэнтычнасці. Можна гаварыць аб наяўнасці спецыфічнага адукацыйнага і сацыялізуючага асяроддзя маёнтка, у якім адбываўся працэс узнаўлення культуры дваранства. Дынаміка трансфармацыі традыцый мемарыялізацыі мінулага ў культуры паменснага дваранства Беларусі ў дадзеным артыкуле разглядаецца ў межах «доўгага XIX стагоддзя», якое, паводле вызначэння С. Ф. Шымуковіча, адпавядае часу знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі [1, с. 4].

Задачы саслоўнага выхавання маладога пакалення дваран вырашаліся ў межах маёнтка разнастайнымі сродкамі. Сама назва сядзібы магла служыць інструментам мемарыялізацыі, – найменні маёнткам, вёскам і фальваркам часам даваліся ў гонар родзічаў памешчыка [7, с. 70–71]. У многіх памешчыцкіх сядзібах Беларусі складаліся нерэгулярныя сямейныя дзённікі (Silva rerum), якія ўключалі звесткі і чуткі грамадска-палітычнага характару, палітычныя сатыры, песні, анекдоты, тосты, удалыя прамовы на пахаваннях, вяселлях і шляхецкіх выбарах, выпісы з прыватных лістоў, памятныя сямейныя і агульнанацыянальныя даты, апісанне надвор'я, гаспадарчыя рахункі і статыстыку, памятныя надпісы з надмагільных помнікаў і г. д. У некаторых дваранскіх сем'ях меліся выявы радавога генеалагічнага дрэва, часам з алегарычнымі сюжэтамі. Мэце захавання сямейных традыцый служылі таксама рукапісныя зборнікі гаспадарчых парад, кулінарных і медыцынскіх рэцэптаў, якія вяліся і перадаваліся звычайна па жаночай лініі [2, с. 69; 3, s. 55–56; 4, s. 231–232].

У дваранскіх маёнтках збіраліся гістарычныя дакументы, партрэты продкаў, кнігі, прадметы мастацтва, сямейныя рэліквіі і проста рэчы «з гісторыяй». Напрыклад, цанілася мэбля з уласным «радаводам». Аб'ектам калекцыяніравання рабіліся антычныя памяткі, пераважна

манеты. Збіраўся саксонскі фарфор, які меў часам памятныя надпісы, напрыклад, кубкі, зробленыя ў гонар канстытуцыі 1791 г. з партрэтам С. Панятоўскага. Сустракаліся шаблі, гузікі ад фракаў, дамскія стужкі і сукні, якія мелі надпіс «1791»; срэбныя лыжачкі з адчаканеным партрэтам князя Ю. Панятоўскага. Падобныя калекцыі ўтрымлівалі надзвычай пярэсты і нераўнацэнны матэрыял. Так, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. папулярным месцам наведвання ў Вільні з'яўляўся кабінет рэдкасцей генерала Юзафа Касакоўскага, у якім дэманстраваліся калекцыі французскіх габеленаў, японскай і кітайскай парцэляны, посуду з горнага крышталю, разьбы па дрэве і слановай косці, зброі часоў Барскай канфедэрацыі, рэчаў, валоданне якімі прыпісвалася гістарычным дзеячам, а таксама іншыя дзівосы, кшталту ключа ад Бастыліі. Курганныя знаходкі дахрысціянскай пары, выробленыя з некаштоўных металаў, не знаходзілі цікавасці ў памешчыкаў. Толькі з паяўленнем Віленскай археалагічнай камісіі (1855–1865) і Віленскага музея старажытнасцей (адкрыты ў 1856 г.) адбывалася пашырэнне ідэі гістарычнай важнасці падобных рарытэтаў [5, s. 139, 230, 258].

Мясцовыя прыватныя бібліятэкі былі шматмоўнымі, аднак пераважалі зборы на польскай і лацінскай мовах. Рэгулярнае камплектаванне хатняй бібліятэкі вымагала ад калекцыянераў значных фінансавых укладанняў. Бібліяфілы намагаліся папоўніць свае калекцыі бібліяграфічнымі рэдкасцямі, аўтографамі, рукапісамі. Істотнымі лічыліся выдавецкія характарыстыкі кнігі (якасці пераплёту, паперы), яе мастацкае афармленне (напрыклад, наяўнасць мініяцюр вядомых ілюстратараў). Практычнае значэнне ў выхаваўча-адукацыйным працэсе мелі калекцыі нотных выданняў, а таксама зборы твораў класікаў. У галерэях айчынных аматараў жывапісу сустракаліся творы старых галандскіх майстроў, італьянскіх мастакоў эпохі Рэнесансу, шматлікія палотны П. П. Рубенса. Іх сапраўднасць застаецца спрэчнай, бо апісанні калекцый таго часу грунтаваліся найчасцей на словах саміх уладальнікаў, а не на экспертнай ацэнцы. Спраўдзіць іх слушнасць не выпадае, бо лёс значнай колькасці прыватных айчынных калекцый невядомы [6, s. 83–85].

Франтоны порцікаў і брам шляхецкіх сядзіб запаўняліся гербавымі картушамі ўладальнікаў маёнтка. Герб роду мог знаходзіцца над камінам, на пячной паліванай кафлі, над уваходам на ганак. Сустракаліся таксама флюгеры, на якіх выбіваўся год пабудовы дома, знаходзіўся герб або ініцыялы гаспадара. Алегарычныя малюнкі, надпісы на польскай і лацінскай мовах, маральныя максімы, жыццёвае крэда і дэвізы сустракаліся на брамах, на папярэчных бэльках дома, над дзвярыма ганка, на дрэвах. На галоўнай папярэчнай бэльцы, якая ўтрымлівала дах, часам выразалі дату пабудовы дома (дзень, месяц і год на лацінскай мове), крыж, імя Ісуса і Багародзіцы, сентэнцыі з маральным зместам, а таксама цяслярскі знак. Бэлькі, якія ўтрымлівалі столь, характарызаваліся суладна перакананню хатніх як «шчаслівыя» і «злыя». Пад «шчаслівымі» бэлькамі, напрыклад, нараджаліся здаровыя дзеці, паненкі атрымлівалі прапановы рукі і сэрца. Мелі распаўсюджанне разнастайныя алегарычныя малюнкі з тлумачальнымі надпісамі часцей усяго на лацінскай мове. Напрыклад, папулярнымі з XVIII ст. былі выявы складзеных у малітве далоняў з надпісам «Deo sic» (Так Богу), далоняў у адкрытым жэсце запрашэння з надпісам «Sic amico» (Так сябру) і далоні, складзенай у дулю з надпісам «Inimico sic» (Так ворагу). Падобнае сустракалася на шырмах, іх рабілі над дзвярыма пакояў і г. д. Часам пры нараджэнні дзіцяці або пры заключэнні шлюбу на манеце надрапваўся год, і такую манету захоўвалі як рэліквію. Школьная моладзь любіла выразаць і надрапваць свае імёны на дрэвах, бэльках і сценах дамоў [8, s. 270, 307; 9, s. 134, 253–254; 10, s. 267].

Уладальнікі маёнткаў збіралі гістарычныя легенды, якія звязвалі гісторыю іх уладання з драматычнымі падзеямі мінулага. Аднак падобныя згадкі, як правіла, не мелі дакументальнага пацверджання. Распаўсюджаным легендарным сюжэтам, напрыклад, было наведванне памешчыцкіх двароў каранаванымі валадарамі. Найбольш папулярнымі у дадзеных легендах персанажамі сярод памешчыкаў-католікаў з'яўлюцца Вітаўт, С. Баторы і Напалеон, у праваслаўных – Кацярына II. Аб многіх храмах, фундаваных памешчыкамі, можна было пачуць, што Напалеон выказваў сваё захапленне іх архітэктурай і шкадаванне, што не можа перанесці гэтыя цудоўныя збудаванні ў Парыж. Часам падобныя сямейныя апокрыфы публікаваліся памешчыкамі асобнымі выданнямі або ўключаліся ў мемуары. З нагоды гістарычных і псеўдагістарычных падзей, якія звязваліся з дадзенай мясцінай, усталёўваліся памятныя дошкі. Паводле іранічнай заўвагі З. Глогера, калі сціпласць замінала гаспадару маёнтка дэманстраваць мемарыяльны пакой, дзе ў вайну 1812 года начаваў генерал Напалеона, то ён заўжды мог паказаць на сцяне свайго дома драпіны ад варожых куль [8, s. 189–190; 343; 371; 5, s. 27].

Паводле К. Тышкевіча, у гістарычнай свядомасці мясцовага прывілеяванага саслоўя ў якасці буйных культурных эпох вылучаліся «пястоўскія часы», эпоха Жыгімонта Старога і каралевы Боны, эпоха Сасаў і часы Станіслава Аўгуста. З «часоў Станіслава Аўгуста» пачыналася «новая эпоха» – сучаснасць. Тое, што было да часоў С. Панятоўскага, называлася даўнінай, «за даўнімі

часамі». Найбольшым прэстыжам «з даўніны» карысталася эпоха Жыгімонта Старога і каралевы Боны, якая прыўнесла шмат навацый у патрыярхальны побыт мясцовай шляхты [5, s. 241].

Мемарыялізаваліся месцы пахавання продкаў. Найбольшым прэстыжам карысталіся мураваныя капліцы з пахавальным радавым склепам, якія ладзіліся пры бажніцах, фундаваных землеўладальнікамі. Падобныя храмы рабіліся сямейным гонарам, ім перадаваліся землі і фальваркі, закупаліся культавыя прадметы, засноўваўся фундуш (з 1843 г. утрыманне рымска-каталіцкіх цэркваў пераходзіла ў юрысдыкцыю ўрада). Набожныя памешчыкі маглі адпісваць у спадчыну цэркваў і манастыроў значныя зямельныя ўладанні. Напрыклад, у Сенненскім павеце памешчык Ф. С. Ляшко спрыяў заснаванню на сваіх землях Няклюдаўскага Барысаглебскага мужчынскага манастыра (1899 г.) [11, с. 90–91].

К. Тышкевіч дае наступнае апісанне склепа роду Радзішэўскіх у Буйвідах: труны былі выраблены з чырвонага дрэва, акаванага серабрыстым металам, спераду труны знаходзілася бляха з гербам, яшчэ адна – з надпісам, у якім згадвалася імя памерлага, – на вечцы. Труна была наглуха забітая. На вечцы часам змяшчалі дошкі з кароткай біяграфіяй (дата з'яўлення на свет, заручыны, шлюб, нараджэнне дзяцей) памерлага і пахвалой яму. Склеп мог мець земляную падлогу, на якой і знаходзіліся труны [5, s. 153].

Калятар (фундатар храма), які пабудаваў бажніцу і забяспечыў яе фундушам, атрымліваў права для сябе і сваіх нашчадкаў уплываць на выбар асобы святара ў выпадку вакансіі. У яго была асобная калятарская лава ў храме, падчас рэлігійных працэсій калятар меў права весці святара пад руку. Фундушы касцёлам маглі давацца пад абавязацельствы, напрыклад, утрымліваць настаўніка для моладзі, пэўную колькасць ксяндзоў, ладзіць фэсты, адкрываць школу або шпіталь. Існаваў звычай згадваць у тастаментах, каб блізкія штогод ладзілі жалобнае набажэнства ў дзень смерці фундатара. У такі дзень родныя памерлага давалі міласціну жабракам. Магла таксама штотыднёва ці некалькі разоў на тыдзень праводзіцца імша за душы фундатараў. На гэтыя мэты адпісваліся спецыяльныя сродкі ці маёмасць. Існаваў звычай закладаць медныя капсулы пад страхой, у якой утрымліваліся дакументы аб фундатары, будаўніцтве і грошы. Герб і імя фундатара бажніцы можна было сустрэць на званах, на франтоне царкоўнага будынка або ўнутры яго. Калятараў, іх нашчадкаў, а таксама членаў касцельнай рады, якія памерлі, знаходзячыся на дадзенай пасадзе, хавалі ў сценах храмаў. Аднак у сямейных пахавальнях на тэрыторыі храма род не меў права хаваць дальніх родзічаў. Калі род фундатара страчваў у дадзенай мясцовасці маёмасць ці закрывалася царква, пахаванні не даглядаліся. Часам здаралася, што спадкаемцамі фундатара аспрэчваліся падараваныя храму або манастыру землі. Былі выпадкі таксама і самавольнага захопу духоўнымі асобамі зямель памешчыкаў [12, s. 50–51; 110, 249; 9, s. 55; 13, s. 155–156; 5, s. 131–133, 144].

Статус касцёла ацэньваўся па памеры фундуша, старажытнасці каралеўскіх прывілеяў, знакамітасці фундатараў, касцельным начынні, вядомасці архітэктара (мураваныя касцёлы цаніліся больш), колькасці парафіян, наяўнасці манастыра, сямейных пахавальняў, шанаваных святыняў, фэстаў, брацтваў (з дазволу рымскага прастолу). У той жа час праваслаўныя цэрквы пераважна былі драўляныя, іх фундатары часам не лічылі нават патрэбным дакументальна засведчваць свой унёсак у іх заснаванне. У 40-я гг. XIX ст. урад надаваў касцёлам класнасць. Важнай статуснай прыналежнасцю касцёла з'яўляліся званы, якія маглі фундавацца багатымі прыхаджанамі і мелі адпаведны дарчы надпіс. Пэўныя касцёлы рабіліся вядомымі дзякуючы працяглым службам, напрыклад, саракагадзіннаму набажэнству [13, s. 144–145, 155–156; 5, s. 253].

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. узнікла мода на складанне элегій у выпадку смерці. Дадзеныя практыкаванні былі недасканалымі з пункта гледжання літаратурнага густу, насілі напышлівы характар, і шэраг інтэлектуалаў зрабілі «элегіяманію» прадметам высмейвання. Існаваў таксама звычай друкаваць па смерці шляхціца клепсідры – карткі, на якіх змяшчаўся алегарычны малюнак, што мусіў адлюстроўваць ідэю хуткабежнасці часу і смутку блізкіх, а таксама ўтрымлівалася тэкставая інфармацыя з лацінамоўнай сентэнцыяй, іменем памерлага, часам і месцам, дзе павінна было адбывацца набажэнства і пахаванне. Меў распаўсюджанне і звычай выпускаць на знак жалобы па памерлых грамадскіх дзеячах парцалянавыя філіжанкі і пярсцёнкі з адпаведнымі надпісамі [3, s. 120; 9, s. 44; 4, s. 11].

Патрэбе ўшанавання гісторыі роду служыў парк, дзе ўсталёўваліся капліцы-пахавальні, помнікі, абеліскі, камяні з эпітафіямі. Шырокую распаўсюджанасць мелі памятныя дрэвы, якія мясцовая легенда звязвала з рознымі славутасцямі («дубы Міцкевіча» і падобнае). Найбольш вялікія дубы мелі ўласныя імёны, аб іх пісала мясцовая прэса, яны рабіліся любімым фонам для фатаграфавання. Гаспадар падобнага дуба, нават калі дрэва ўжо памірала, клапаціўся захаваць аб ім памяць: з калод падобных дрэў выраблялiся альтанкі або капліцы. Маладыя парасткі каля гэтага месца з часам наследавалі «бацькоўскую» славу [12, s. 307].

На дарогах (раздарожжах), у вёсках, на цвінтарах, на месцы даўніх храмаў, капліц, палях бітваў можна было сустрэць драўляныя крыжы. Яны ставіліся, каб людзі маглі памаліцца або за невядомых памерлых, або за канкрэтных людзей, імёны якіх былі ўказаны на крыжы (кшталту «крыж пастаўлены за душу памерлага …»). Крыжы маглі ставіць людзі, якія каяліся ў нейкім учынку, або хацелі падзякаваць за выбаўленне ад хваробы, або каб вылечыцца ці спыніць эпідэмію, у тым ліку і сярод жывёл. Пад падобнымі крыжамі (але не на зямлі цвінтара) маглі хаваць самагубцаў. Пад прыдарожнымі крыжамі таксама жабравалі. У апошняй чвэрці XIX ст. крыжы сталі вырабляць з металу і ставіць на каменным падмурку [12, s. 190; 14, s. 167].

Такім чынам, разнастайнымі сродкамі ў маёнтках фарміравалася выхаваўчае асяроддзе, у якім маладое пакаленне дваран набывала першыя веды пра край і род. Нават руіны сядзібнага дома, пераходзячы ў катэгорыю нацыянальнай спадчыны і гістарычнай рэліквіі, працягвалі служыць выхаваўчым мэтам.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Шимукович, С. Ф.* Белорусские региональные элиты периода «Долгого XIX века» как предмет исторического исследования: обоснование понятия / С. Ф. Шимукович // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы : исследования по Новой и Новейшей истории / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.].– Минск: РИВШ, 2017. – Вып. 1. – С. 3–12.

2. *Шыдлоўскі, С. А.* Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795–1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 168 с.

3. *Gloger, Z.* Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk P. Laskauera i W. Babickiego, 1900–1903. – T. 2. – 1901. – 332 s.

4. *Gloger, Z.* Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk P. Laskauera i W. Babickiego, 1900–1903. – T. 4. – 1903. – II, 523, [5] s.

5. *Tyszkiewicz, K.* Wilija i jej brzegi : pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. – Drezno: Drukiem i nakładem Józefa I. Kraszewskiego, 1871. – XVI, 362 s.

6. *Kraszewski, J. I.* Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy / J. I. Kraszewski. – Paryż: Nakładem J. K. Wilczynskiego, 1860. – 144 s.

7. *Юрчак, Д. В.* Усадьба И. А. Маньковского «Милое»: история создания, первозданный облик и перспективы восстановления / Д. В. Юрчак, Ю. В. Юрчак // Искусство и культура : научно-практический журнал. – 2013. – № 3. – С. 69–73.

8. *Gloger, Z.* Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce : w 2 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk Wl. Lazarskiego, 1907–1909. – T. 1. – 1907. – 383 s.

9. *Gloger, Z.* Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk P. Laskauera i W. Babickiego, 1900–1903. – T. 3. – 1902. – 350 s.

10. *Gołębiowski, Ł.* Domy i dwory / Ł. Gołębiowski. – Warszawa: Druk. N. Gkücksberga, 1830. – [4], 296 c.

11. *Аникиевич, К. Т.* Сенненский уезд Могилёвской губернии: опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях, с картой уезда, схемой двух озёр и рисунками в тексте / К. Т. Аникиевич. – Могилёв : Губерн. тип., 1907. – 149 с.

12. *Gloger, Z.* Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk Piotra Laskauera i S-ki, 1900–1903. – T. 1. – 1900. – 316 s.

13. *Tyszkiewicz, E.* Opisanie powiatu borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim, z dodaniem wiadomości : o obyczajach, spiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach itd. / E. Tyszkiewicz. – Wilno: Druk. A. Marcinowskiego, 1847. – 489, IV s.

14. *Gloger, Z.* Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce : w 2 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk Wl. Lazarskiego, 1907–1909. – T. 2. – 1909. – 192 s.

**Дата паступлення: 10.10.2018.**